*Б.А.ЛАЗУКА*

# БЕЛАРУСКАЕ БАРОКА: ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ АНАЛІЗУ СТРУКТУРЫ СТЫЛЮ

*Упершыню разглядаюцца галоўныя прынцыпы аналізу структуры стылявога працэсу ў пластычна-выяўленчых мастацтвах Беларусі эпохі барока, гістарычная, саслоўная, этнічная, канфесійная абумоўленасць асноўных тэндэнцый развіцця мастацкай практыкі, звязаная з іх этапнасцю, зменлівасцю, асінхроннасцю, пераемнасцю.*

Даследаванне гістарычнай абумоўленасці і нацыянальнай спецыфікі беларускага барока ў пластычна-выяўленчых відах мастацтваў патрабуе распрацоўкі і прыняцця некалькіх важных агульнатэарэтычных і метадалагічных пасылак. Іх вылучэнне дазволіць паслядоўна і абгрунтавана пабудаваць аналіз стылю, выявіць характэрныя заканамернасці яго развіцця, акрэсліць накіраванасць і прычыны ўнутраных змен, адметнасці структуры.

Кожная са стылявых сістэм разгортваецца ў складаным комплексе суадносін мастацкай практыкі з гісторыка-палітычнымі, канфесіянальнымі, са- слоўнымі, этнічнымі і сацыяльнымі ўмовамі жыцця грамадства. Не менш важным і прынцыповым тэарэтычным палажэннем з'яўляецца трактоўка мастацкага стылю зыходзячы з яго шматузроўневасці. Успрыманне барока ў межах гістарычна дэтэрмінаванага працэсу прадугледжвае вызначэнне яго як гістарычнага стылю, ці стылю эпохі. Пры гэтым неабходна дыферэнцыраваць іншыя ўстойлівыя формы, адпаведныя нацыянальнай спецыфіцы (нацыянальны стыль, нацыянальна-стадыяльны стыль), лакальным зонам (стыль мастацкай школы), аўтарскім утварэнням (аўтарскі стыль). Акрамя гэтага, пры разглядзе нацыянальнага і нацыянальна-стадыяльнага стыляў трэба мець на ўвазе іх адрозненні, што вызначалі развіццё мастацай практыкі ў часавых межах, а таксама ў саслоўнай, канфесіянальнай, этнічнай прасторах.

Названыя ўзроўні развіцця і функцыянавання стылявой абумоўленасці мастацкага працэсу не маюць прынцыповага разыходжання. Яны базіруюцца на аснове ўзгодненасці прынцыпаў светаўспрымання, спосабаў стварэння мастацкай вобразнасці і вызначаных формаў яе адлюстравання па законах цэласнасці і адзінства [1, с. 44]. Такім чынам, можна адзначыць, што вяршэнства ў структуры стылістыкі належыць стылю эпохі, або гістарычнаму стылю.

Калі прыняць за аснову, што гістарычны стыль уяўляе сабой устойлівае сістэмнае адзінства змястоўнай формы, вобразна-пластычных прынцыпаў і фармальных кампанентаў, а яго разгортванне адбываецца ў часавых і тэрытарыяльных межах, то можна канстатаваць, што стыль уяўляецца вызначальным кірункам у развіцці культуры, дэтэрмінаваным рознымі фактарамі. Яшчэ адзін аспект трэба лічыць базавым: структурна стыль складаецца з асобных узаемазвязаных, а часта і ўзаемаабумоўленых тэндэнцый. У межах тэндэнцый існуюць напрамкі – утварэнні больш дробныя, рухомыя, поліварыянтныя і структурна залежныя ад тэндэнцыі.

Гэты падзел адлюстроўвае характар развіцця не толькі пластычна-выяўленчых відаў і жанраў мастацтваў у іх функцыянальным аспекце, але і мастацкай рэальнасці ўвогуле як сукупнасці філасофска-эстэтычных, маральных, этычных, светапоглядных канцэпцый і іх пачуццёва-канкрэтнага ўвасаблення. Змены, што адбываюцца ў межах тэндэнцый і напрамкаў, з'яўляюцца галоўнай падставай у эвалюцыі стылю, яны вызначаюць яго развіццё, надаюць яму якасць дынамічнай сістэмы, якая знаходзіцца ў працэсе пастаяннага руху

Уся структура айчыннага барочнага стылю акрэсліваецца трыма групамі тэндэнцый. Першую складаюць тыя, якія прасочваюцца на працягу эпохі і, па сутнасці, маюць скразны характар. Яны праяўляюць сябе ў пэўных мадыфікацыях ад часу ўзнікнення стылю да перыяду, калі барока саступіла сваё ўсёабдымнае першынство ў пластычна-выяўленчых відах мастацтваў. Другую групу складаюць тэндэнцыі, якія ў межах барочнага перыяду развіцця пластычных мастацтваў мелі кароткі час існавання, былі ўласцівы той частцы мастацкай практыкі, што культывавалася ў пэўных саслоўных і канфесіянальных колах грамадства, асобным відам і жанрам. Трэцюю групу тэндэнцый адрозніваюць спадчынна-рэтраспектыўныя якасці. Ім уласціва прысутнасць у пластычна-выяўленчых відах мастацтваў у пачатку і ў завяршэнні стылю.

Важным метадалагічным палажэннем з'яўляецца прызнанне жанрава-відавой этапнасці разгортвання стылю. Пад ёю разумеюцца часавыя адрозненні (асінхроннасць) уваходжання, адаптацыі і выпрацоўкі барочных змястоўна-пластычных элементаў. Асноўнай прычынай

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

асінхроннасці можна лічыць як саму спецыфіку мастацкай жанрава-відавой сукупнасці, так і стан развіцця яе асобных частак.

У сённяшнім нацыянальным мастацтвазнаўстве самым распаўсюджаным з'яўляецца падыход, адпаведна якому барока разглядаецца як паслядоўная змена вызначаных этапаў (перыядаў): ранняе, сталае, позняе (2, с. 16; 3, с. 11, 98, 127, 244). Зыходзячы з логікі развіцця любога працэсу гэта, безумоўна, так. Аднак тыя даследаванні, якія былі праведзены і праводзяцца ў галіне пластычна-выяўленчых відаў мастацтваў, паказваюць, што барока па-рознаму ахоплівала станковы і манументальны жывапіс, дэкаратыўную, мемарыяльную і станковую пластыку, станковую і кніжную гравюру, дойлідства. Так, А.Лявонава, разглядаючы беларускую скульптуру перыяду барока, называе часам з'яўлення стылю першую палову XVII ст. Але даследчыца звяртае таксама ўвагу на адчувальныя ў пластыцы рэнесансныя традыцыі, якія працягвалі існаваць значны перыяд разам з раннебарочнымі. Аналізуючы мастацкую практыку, аўтар абапіраецца галоўным чынам на творы, пачынаючы з сярэдзіны – другой паловы XVII ст., а лінію рэнесанснага стылю ў беларускай пластыцы яна прасочвае да сярэдзіны XVII ст. (5, с. 63, 110–115). Нават некаторыя жанры (напрыклад, партрэт, абраз) дэманструюць разыходжанні ў часе і характары засваення стылю. Ён неаднолькава інтэнсіўна ўваходзіў у мастацкую практыку, што выпрацоўвалася асобнымі канфесіянальнымі, саслоўнымі слаямі. Гэта часта выклікае памылковае ўяўленне, што барока на тэрыторыі Беларусі не мела такой усёабдымнай уласцівасці або якасці, якую можна назіраць у культуры шэрага краін Заходняй Еўропы.

У чым жа прычына асінхроннасці? Важным і прынцыповым тут з'яўляецца наяўнасць спецыфікі асобных відаў і жанраў мастацтваў, якія ёсць не столькі сума дыктату асноўных "радавых" прымет, колькі вынік працяглага функцыянавання дадзеных відаў і жанраў у гістарычна вызначаных нацыянальных умовах, у спецыфічным свеце запатрабаванняў сацыяльных груп грамадства. Такая спецыфічнасць праяўляецца ў адметнасцях фармальнай пабудовы, характары бытавання таго ці іншага твора, што ў сваю чаргу адбіваецца на фарміраванні этапаў (ступеняў) мастацкага развіцця.

У вызначэнні прынцыпова важных, канцэптуальных па сваёй значнасці праблем, якія акрэсліваюць вывучэнне тэндэнцый і напрамкаў у беларускім барока, не апошняе месца займаюць пытанні пераемнасці паміж асобнымі стылявымі эпохамі. Даследаванні гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў літаратуры, музыкі, тэатра дазваляюць гаварыць не аб знікненні, нават не столькі аб стылявой трансфармацыі, колькі аб існаванні ў мастацтве пэўнага часу стылявых рыс, падобных да тых, якія былі ўласцівы творчай практыцы ў мінулым. Трактоўка паўтаральнасці стылю як архаічнай плыні будзе не зусім дакладнай, няздольнай адлюстраваць сапраўдны стан культурнага жыцця эпохі, якая вывучаецца.

Мы сканцэнтруем увагу на некаторых галоўных аспектах паняццяў "рэтраспекцыя" і "спадчыннасць", якія маюць непасрэднае дачыненне да пытанняў у галіне пластычна-выяўленчых відаў мастацтваў. Паміж імі існуюць безумоўныя адрозненні. Пад паняццем "спадчыннасць" трэба разумець разнастайныя з'явы, што назіраюцца ў даследуемай мастацкай практыцы (у нашым выпадку – барочнай) па прычыне яе нязначнай аддаленасці ад мінулай стылявой эпохі або ў сувязі са скарочаным этапам праходжання (так званы "сціснуты" варыянт). Паняцце "рэтраспекцыя", у адрозненне ад паняцця "спадчыннасць", уяўляе сабой свядомы зварот (як вобразна-пластычны прыём) да мастацкай мовы значна аддаленай стылявой эпохі.

Пытанне аб паўтаральнасці стылю папярэдняй эпохі, пераўтворанай у адзін з напрамкаў новага якаснага стану мастацтва, зусім не азначае пашыранай трактоўкі стылю як сузіральнай канцэпцыі, уласцівай культуры самых розных рэгіёнаў і эпох, што можна часта сустрэць у мастацтвазнаўчых працах. Вядомае сцвярджэнне Ж.Бюфона, што стыль ёсць чалавек, можа, не столькі адпавядае праўдзе, колькі патрабуе тлумачэння ці дапаўнення. Як катэгорыя надасобасная стыль залежыць ад чалавека толькі таму, што ён з'яўляецца тварцом гістарычных, эканамічных, канфесіянальных умоў грамадскага жыцця, стыль не можа ўзнікнуць ніадкуль, як не можа і знікнуць бясследна. Погляды людзей, канцэпцыі іх адносін да свету застаюцца зафіксаванымі ў мастацкіх творах. Менавіта гэтая асаблівасць з'яўляецца адной з прычын частага праяўлення ў сучасным мастацтве стыляў мінулага.

Гэтыя агульнатэарэтычныя і метадалагічныя палажэнні, перанесеныя на нацыянальную мастацкую практыку барока, дазваляюць дыферэнцыраваць у ёй глыбокія і разгалінаваныя раманскія, гатычныя, рэнесансныя, візантыйскія і маньерыстычныя традыцыі як пазітыўныя ўвасабленні сацыяльна-духоўнага і гістарычнага вопыту. Яны арганічна, цэльна ўваходзілі ў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

новыя мастацкія арыентацыі, уплывалі на фарміраванне нормаў і параметраў барочнага стылю, мянялі акцэнты ва ўжо існуючай сістэме культурных каштоўнасцей. Пры гэтым часцей за ўсё барочнае светаўспрыманне і фармальна-мастацкія метады яго адлюстравання браліся з рэнесанснай эпохі (7, с. 4–5). Цесная сувязь адзначанага прасочваецца і з праблемай не менш прынцыповай і важнай – наяўнасцю паскарэння (скарачэння) ці запавольвання этапаў разгортвання стылю. На наяўнасць такога феномену ў гісторыі сусветнай культуры звяртаюць увагу даследчыкі розных школ у дачыненні да асобных нацыянальных і рэгіянальных культурных эпох. На гэтую заканамернасць звяртаецца ўвага таксама і ў працах, прысвечаных беларускаму мастацтву. Аднак канстатацыя наяўнасці паскарэння ці запавольвання функцыянавання таго або іншага стылю, своеасаблівага скарочанага варыянту не вычэрпвае ўсёй значнасці пытанняў, што ўзнікаюць у сувязі з гэтым.

Паскарэнне ці запавольванне эвалюцыі стылявых працэсаў у мастацтве Беларусі XVII–XVIII стст. абумоўлівалі знешнія і ўнутраныя прычыны. Галоўныя з іх можна звесці да наступных: уплыў рознаўзроўневага складу грамадства, зменлівасць палітычных сітуацый, уздзеянне пэўных традыцый культурнага развіцця, магчымасць пашырэння кантактных сувязей, наяўнасць генетычнай блізкасці і тыпалагічных зыходаў, поліцэнтрызм культурных зносін. Гэта тое, што складае генетыка-кантактна-тыпалагічную сукупнасць з'яў мастацкага працэсу. Менавіта названыя прычыны прама ці ўскосна былі ў аснове змен мастацкай практыкі, яны фарміравалі адметную рытміку традыцыйных этапаў праходжання стылю (ранні, сталы, позні). Адсюль становіцца зразумелым, чаму беларускае барока ў сваім развіцці прайшло шлях не зусім адэкватны ў часавых межах класічным цэнтрам еўрапейскай барочнай культуры. Гэта ўвогуле не азначае другараднасці нацыянальнага варыянту стылю. Па сваёй спецыфіцы, характары беларускія пластычна-выяўленчыя віды мастацтваў XVII–XVIII стст. развіваліся ў адзіным рэчышчы агульнаеўрапейскай традыцыі.

Пры аналізе мастацкай практыкі Беларусі эпохі барока звяртаюць на сябе ўвагу нязначныя адрозненні вобразна-пластычнага плана, уласцівыя творам айчынных і замежных майстроў. Важна падкрэсліць і тое, што састаўныя часткі зместу і формы (мастацкі вобраз, іканаграфія, сюжэт, выяўленчая тэматыка, жанравая структура, кампазіцыя, каларыт) з'яўляюцца стылеўтваральнымі, яны выступаюць носьбітамі стылю. Стылявое адзінства беларускага барока дасягаецца ўнутраным структурным адзінствам – арганічнай цэльнасцю і неразрыўнасцю тэндэнцый пры адначасовай іх нязлітнасці, іншымі словамі – дыялектычнасцю дзеяння механізма ніведіроўкі ўзаемаўзгодненасці, здавалася б, знешне розных з'яў мастацкага развіцця, які абумоўліваецца адной асновай – стылем.

Для барока важны выбарачны прынцып паўтаральнасці. Гэты прынцып дапускае не проста паўтор мастацкіх формаў. Ён будуецца на перавазе агульнага над прыватным. Зыходзячы з адзначанага ў практыцы пластычна-выяўленчых відаў мастацтваў Беларусі эпохі барока можна вылучыць групу тэндэнцый, акрэсленых зваротам да вобразна-пластычных пабудоў, уласцівых культуры мінулага. Да іх ліку трэба аднесці рамана-готыка-рэнесансную, візантыйскую, маньерыстычную тэндэнцыі і тэндэнцыю антыкізацыі. Гэты падзел адлюстроўвае агульную структуру толькі часткі нацыянальнага барочнага стылявога працэсу.

Асобнае месца займаюць псеўдаманьерыстычная і ракайльная тэндэнцыі. Першая з іх адлюстроўвае мастацкую з'яву дастаткова своеасаблівага ладу. Справа ў тым, што кожная са стылявых сістэм непазбежна ўступае ў перыяд, калі ў ёй пачынаюць назірацца якасці "стомленасці", што выяўляецца ў пільнай увазе да знешніх фармальных пабудоў, ва ўскладнёнасці мастацкай мовы, у парушэнні здольнасці стылю да сінтэзу мастацтваў, тое, што паслужыла ў свой час падставай назваць маньерызм маньерызмам. У дадзеным выпадку стылявы працэс робіць своеасаблівы віток, развіваючыся па спіралі, вяртаючыся да свайго пачатку, але ўжо на новым якасным узроўні (6, с. 20–22; 4, с. 386).

Важнай праблемай стылявой дыферэнцыяцыі айчыннага мастацкага працэсу XVIII ст. з'яўляецца вызначэнне ў ім месца ракако. Пры ўліку ўсяго вышэйсказанага аб паняццях "гістарычны стыль" і "стыль эпохі" – базавых для дадзеных канцэптуальных пабудоў – і, абапіраючыся на факты змяненняў у эканамічным, саслоўным, канфесіянальным аспектах жыццядзейнасці грамадства, наяўнасці крызісных з'яў у кіраванні дзяржавай, узрастаючай кансерватыўнасці шляхты, можна прызнаць існаванне ракайльнай тэндэнцыі ў рэчышчы барока. У большай ступені яе прысутнасць заўважаецца ў прасторава-пластычных мастацтвах – архітэктуры, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладных творах. Але і сацыяльна-канфесіянальнае бытаванне гэтай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэндэнцыі мае свае адметнасці, якая выпрацоўвалася пераважна ў асяроддзі арыстакратычна-прафесійнага мастацтва, была характэрная для дзейнасці мастакоў, якія працавалі для царквы.

Стыль барока не аднолькава інтэнсіўна развіваўся не толькі ў розных пластычна-выяўленчых відах мастацтва, канфесіянальных сферах, але і ў розных сацыяльных слаях. Значная частка яго мастацкай практыкі звязана з нізамі грамадства. Важнай адзнакай "нізавога барока" з'яўляецца знікненне адрозненняў паміж унікальным, высокамастацкім і масавым. Найбольш інтэнсіўна гэты працэс развіваўся з канца XVII ст., калі адбылася дыферэнцыяцыя мастацтва на нізавое (паўпрафесійнае) і прафесійнае.

З'яўленне зніжаных формаў мастацтва звязана з законамі развіцця стылю, яго поліварыянтнасцю, збліжэннем з плебейскім асяроддзем. Збліжэнне барока з нізамі грамадства, і ў гэтым яго адметнасць, адбывалася ў некалькі этапаў. На першым захоўвалася спецыфічная відавая прыналежнасць мастацкіх твораў, у нязменным выглядзе паўтараліся прыёмы вобразна-пластычнай пабудовы, традыцыйнай заставалася і сфера функцыянавання. На другім адбываліся істотныя "дапрацоўкі" стылю, не толькі сфарміраванага ў арыстакратычным асяроддзі, але і стылю, ад асобных варыянтаў якога эліта пачынала адмаўляцца. У барочнай мастацкай практыцы назіраецца яшчэ адна цікавая з'ява – канвенцыянальны рух нізавых формаў у прафесійную мастацкую дзейнасць. Змяшэнне розных пластычных прыёмаў, універсалізм вобразна-пластычных пабудоў, у якіх адлюстраваліся розныя па сацыяльным паходжанні каштоўнасныя агульнасці, вялі да дамінавання эстэтыкі мэтазгоднасці, перавагі асобных відаў мастацтва, галоўным чынам дэкаратыўна-прыкладнога і дойлідства.

Адной з важнейшых тэндэнцый развіцця барочнага стылю, якая надала характэрнасць тагачасным пластычна-выяўленчым мастацтвам, быў сарматызм. Яго абумоўлівалі ментальнасць, спосабы жыцця шляхты, а таксама рэалізацыя варыянтаў яе культурных інтарэсаў. Імкненне да абазначэння сваёй выключнасці, сцвярджэнне правоў прадстаўнікамі дадзенай саслоўнай катэгорыі прывялі не толькі да даўгавечнасці сарматызму, але і да магчымасці ўспрымання яго ў адпаведных культурна-мастацкіх формах іншымі саслоўнымі групамі. Ва ўзнікненні, развіцці сармацкай тэндэнцыі акрэслена выступаюць некалькі перыядаў. Першы завяршаецца канцом XVI ст., калі ўстанаўліваюцца асновы шляхецкай самасвядомасці, адбываецца канстытуіраванне гэтага саслоўя. Другі, найбольш працяглы, гэта XVII – першая палова XVIII ст. Ён характарызуецца ўваходжаннем сармацкіх канцэпцый у духоўны і матэрыяльны свет жыцця шляхты. Адбываецца ўзаемапранікненне сарматызму і каталіцызму, калі ідэал грамадзяніна атаясамліваецца з адданасцю служэння каралю, вялікаму князю, касцёлу. Апошні, трэці (сярэдзіна – канец XVIII ст.), абумоўлены працэсамі эвалюцыяніравання становішча шляхты. Сарматызм набывае якасці стэрэатыпу, пераўтвараецца ў асноўны аргумент і інструмент, які накіроўваецца шляхтай супраць афіцыйнай палітыкі дзяржавы, набывае якасць апазіцыі.

Узнікненне і шырокае распаўсюджанне арыенталістычнай тэндэнцыі было абумоўлена дзвюма галоўнымі прычынамі. У аснове першай знаходзіліся непасрэдныя кантакты або асацыятыўныя сувязі з Усходам і Поўднем: ваенныя падзеі, пагадненні, гандаль, мецэнацтва каралеўскага двара і магнатэрыі, развіццё навукі і адукацыі, канфесіянальныя кантакты, нацыянальныя культурныя традыцыі асобных этнічных частак насельніцтва. Другая тлумачыцца якасцямі стылю, па сваёй прыродзе схільнага да экзатычнага, незвычайнага. Арыенталістычныя з'явы ў беларускім барочным мастацтве прайшлі некалькі перыядаў развіцця, мелі змены ў накіраванасці і змесце, апелюючы напачатку да культуры Турцыі, Персіі, затым – Кітая і Японіі. Арыенталістычная плынь атрымала ў далейшым працяг у неабарока, якое разам з іншымі неастылямі прысутнічала ў айчынным мастацтве ў канцы XIX – пачатку XX ст.

Такім чынам, аналіз барочнага стылявога працэсу, зроблены на падставе прызнання яго абумоўленасці саслоўнымі, канфесіянальнымі, этнічнымі фактарамі, жанрава-відавой этапнасці развіцця, разгортвання ў часавых і тэрытарыяльных межах, дазваляе дыферэнцыраваць у ім шэраг узаемазвязаных тэндэнцый, якія аб'ядноўваюцца ў тры асноўныя групы: па характары, працягласці і ступенях прысутнасці ў культурным жыцці. Гэта стварае асновы для больш глыбокай і адэкватнай ацэнкі ўсёй сукупнасці з'яў мастацкай практыкі XVII–XVIII стст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Вагнер, Г.К.* Канон и стиль в древнерусском искусстве / Г.К.Вагнер. – М.: Искусство, 1987.
2. *Высоцкая, Н.Ф.* Искусство Белоруссии XII–XVIII вв. / Н.Ф.Высоцкая. – Мн., 1994.
3. *Гісторыя* беларускага мастацтва: у 6 т. – Мн.: Навука і тэхніка, 1988. – Т. 2.
4. *Лихачёв, Д.С.* Социально-исторические корни отличий русского барокко от барокко других стран / Д.С.Лихачёв // Сравнительное изучение славянских литератур: материалы науч. конф., 18–20 мая 1971 г. – М., 1973.
5. *Лявонава, А.К.* Старажытнабеларуская скульптура / А.К.Лявонава. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991.
6. *Саробьянов, Д.В.* Стиль модерн. Истоки. История. Проблемы / Д.В.Саробьянов. – М.: Искусство, 1989.
7. *Софронова, Л.А.* Барокко и проблемы славянских литератур и искусств / Л.А.Софронова, А.В.Липатов // Барокко в славянских культурах. – М.: Наука, 1982.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ